**УДК 903.25:671.121.9"638"(476)** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-69-1-18-23**

# АБ НОВЫХ ЗНАХОДКАХ СЯКЕРАПАДОБНЫХ ПАДВЕСАК НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***У.А. ЛУЧШАВА***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***
***e-mail: luchsheva99@tut.by***

*Праца прысвечана сякерападобным падвескам з тэрыторыі Беларусі, якія былі знойдзены за апошнія гады. Разгледжаны пытанні інтэрпрэтацыі дадзеных упрыгожанняў, іх датыроўка і картаграфія. Падвескі з тэрыторыі Прыпяцкага Палесся з'яўляюцца сведчаннем суіснавання гоцкага насельніцтва і насельніцтва ўсходнееўрапейскай лясной зоны на працягу большай часткі гунскага часу, а "сякеркі" з тэрыторыі Панямоння – аб паступовым перамяшчэнні часткі гоцкага насельніцтва ў бок сучаснай Літвы. Прадстаўленыя высновы могуць быць выкарыстаны для далейшага вывучэння кантактаў усходнееўрапейскай лясной зоны і гоцкага насельніцтва ў гэты перыяд.*

***Ключавыя словы:*** *археалогія Беларусі, жалезны век, познерымскі час, вельбарская культура, готы, шыйныя ўпрыгожанні, сякерападобныя падвескі, картаграфія, тыпалогія.*

**Уводзіны.** Сякерападобныя падвескі ўяўляюць сабой мініяцюрныя выявы сякерак. Яны з'явіліся на тэрыторыі Міжземнамор'я ў антычны перыяд і бытавалі ў культуры народаў Еўропы да ранняга Сярэднявечча ўключна. У I ст. да н.э. – п.п. III ст. н.э. падвескі, якія імітуюць адно- або дзвухлязовыя сякеры і сякеры-кіркі, вядомыя ў культуры гета-дакійскіх, сармацкіх плямёнаў Падунаўя і насельніцтва Паўднёвага Крыма. Бліжэй да рубяжу эр у гэтым культурным коле з'яўляюцца, у нашым успрыманні "класічныя", сякерападобныя падвескі. Аднак шырока яны распаўсюдзіліся пазней: толькі ў познерымскім часе ў полікультурным асяроддзі еўрапейскага Барбарыкума [1, s.100; 2, с. 59–67]. Выраблялі падвескі тэхнікай ліцця. Формы для адлівання, а таксама загатоўкі апошнім часам знаходзяць на тэрыторыі Украіны [3, с. 179].

Падобныя ўпрыгожанні часта паходзяць з жаночых пахаванняў, радзей іх знаходзяць у дзіцячых, а ў некаторых выпадках яны сустракаюцца і ў мужчынскіх, могілках. Трэба таксама адзначыць, што такія падвескі, хутчэй за ўсё, не з'яўляліся паказчыкамі сацыяльнай ролі нябожчыка пры жыцці [4, s. 124–125].

Сякерападобным падвескам часта прыпісваюць апатрапейную ролю. Звычайна іх звязваюць з культам багоў, якія валодаюць сіламі прыроды і ладам свету. Прыкладам такога бога з'ўляецца скандынаўскі Тор, ад назвы якога паходзяць больш пазнейшыя "сякеркі" або "малаточкі Тора". У старажытнагерманскай міфалогіі аналагам гэтага скандынаўскага бажаства з'яўляўся Донар – бог грому, буры і ўрадлівасці, чароўны волат, які абараняе багоў і людзей ад веліканаў і пачвар [4, s. 124–125]. Падобныя амулеты вельмі часта мелі форму звязанага з дадзеным богам прадмета, і іх нашэнне павінна было абараніць ад няшчасцяў [4, s. 126]. "Малаточкі Тора" маглі насіць хворыя, верачы ў магічныя ўласцівасці дапамагаць у выздараўленні. Аб іх ахоўнай функцыі можа сведчыць і звычка насіць "сякеркі" падчас родаў, а таксама жаданне абараніць жанчыну, калі яе муж або бацька ішоў на поле бою. Яны таксама маглі быць сімвалам загінуўшага родзіча [4, s. 126]. З пункту гледжання кантэксту бытавання падвесак у выглядзе мініяцюрных сякер, у асноўным, у жаночых пахаваннях, такая інтэрпрэтацыя іх сімвалічнага сэнсу здаецца цалкам верагоднай.

Падвешваліся сякерападобныя падвескі праз адтуліну на вушцы ці больш складаным чынам – на колцы з перамотанымі канцамі або спіральным шчытком. Іх насілі ў складзе шыйных упрыгожанняў, дзе такія падвескі кампанаваліся пераважна разам з дыскападобнымі і прадаўгаватымі пацеркамі, маглі падвешвацца таксама на шыйныя грыўны [5, s. 211]. Вядомыя выпадкі, калі сякерападобныя падвескі мацаваліся да бранзалетаў і паясоў [1, s. 100; 2, с. 63]. Пры гэтым адзначаюцца пэўныя адрозненні ў спосабе нашэння сякерападобных падвесак у розных народаў Барбарыкума: гета-дакі I–II стст. мацавалі іх да грыўнаў і бранзалетаў, германцы Эльба–Везэрскага міжрэчча і готы насілі іх пераважна ў складзе шыйных упрыгожанняў. Сарматы маглі насіць іх на шыі ў складзе калье або проста як амулет, а таксама на правым перадплеччы як частку наборнага бранзалета з пацерак, завязвалі іх на асобным шнуры, а таксама вешалі "сякеркі" па 1–5 штук на пояс разам з іншымі амулетамі. На тэрыторыі Беларусі ўсе, вядомыя нам сёння, "класічныя" сякерападобныя падвескі знойдзены па-за пахаваннямі[1], таму казаць пра іх выкарыстанне і месца ў касцюме немагчыма.

Сякерападобным падвескам было прысвечана некалькі абагульняючых артыкулаў А. Какоўскага [1], А. Стаянавай [6], В. Беляўца [2], Г. Гулы [7], у якіх агаворваюцца пытанні іх тыпалогіі, картаграфавання і культурнага кантэксту. Прынятая сёння тыпалогія сякерападобных падвесак была распрацавана ў 1998 г. А. Какоўскім. Ім было прапанавана вылучаць 6 тыпаў, якія адрозніваюцца між сабой формай.

Так, да тыпу 1 былі аднесены самыя раннія сякерападобныя падвескі, якія выглядалі як мініяцюрныя копіі сапраўдных сякер і кірак. Тып 2 па А. Какоўскаму – падвескі падтрохвугольнай формы з бляхі, забяспечаныя

[1] Падвеска ў выглядзе мініяцюрнага цясла, або ўтулкавай сякеры, знойдзеная ў пахаванні № 49 могільніка Брэст-Трышын, мае іншую форму, канструкцыю і спосаб мацавання, чым тыповыя сякерападобныя падвескі рымскага часу, з прычыны чаго павінна разглядацца асобна [8, с. 50].

невялікім вушкам, з моцна выгнутым лязом, якое не выходзіць, аднак, за межы плечукоў. Тып 3 – плоскія падвескі, контур якіх блізкі да раўнабедранага трохвугольніка, з дугападобным лязом і доўгім вузкім вушкам. Тып 4 – плоскія падвескі, з падобным да "якара" лязом з моцна ўвагнутымі бакамі і выразна прыўзнятымі плечукамі, вызначаюцца таксама масіўнымі вушкамі, часта багата прафіляванымі. Падтып 4А – вушка ў іх атрымана шляхам перагібу канца тулава ў пяцельку. Тып 5 – падвескі ў выглядзе высокага трохвугольніка, якія маюць моцна клінаватае сячэнне з адтулінай у найбольшым пашырэнні. Тып 5А – падвескі з вушкам, як у тыпа 4А. Тып 6 – са звонападобным контурам і моцна выгнутым лязом [1, s. 100–101]. А. Какоўскім таксама былі зроблены высновы адносна распаўсюджання гэтых падвесак. Так, тып 1 найбольш шырока прадстаўлены ў сярэднім цячэнні Дуная і на Крымскім паўвостраве; падвескі тыпаў К.2 і К.3 найчасцей выступаюць у культурах гоцкага кола (вельбарскай, чарняхоўскай культурах і масламенцкай групе); падвескі тыпа К.4 былі папулярны, перадусім, у германцаў, якія жылі паміж рэкамі Лаба і Вэзар; тып К.5 звязаны пераважна са старажытнасцямі сарматаў Вялікай Дунайскай раўніны; падвескі тыпу К.6 не маюць выразных зон канцэнтрацыі [1, s. 106–107].

Трэба адзначыць, што А. Стаянава ў сваёй працы таксама разглядае падобныя падвескі, падзяляючы іх на два асобныя тыпы. Тып 1 – двухлязовыя падвескі-сякеркі, у якіх абодва лёзы знаходзяцца ў адной плошчы, а канал адтуліны – у цэнтры, у самым шырокім месцы папярэчнага сячэння [6, с. 48]. Тып 2 – таксама двухлязовыя падвескі, у якіх лёзы размяшчаюцца ў двух плошчах, перпендыкулярна адно аднаму, а канал адтуліны – у цэнтры [6, с. 48].

Разглядаючы сякерападобныя падвескі, адкрытыя ў кантэксце культуры сарматаў Падунаўя, Г. Гулы прапанавала іншую тыпалогію такіх падвесак, асноўнымі крытэрыямі ў якой з'яўляецца форма ляза, а таксама іх месца ў касцюме [7, o. 133]. Даследчыца вызначае 3 тыпа, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на падтыпы. Да I тыпу адносяцца падвескі ў выглядзе аднalязовых сякер[2], якія падзяляюцца на 6 падтыпаў у залежнасці ад шырыні ляза [7, o. 134–135]. У тып II вылучаны падвескі, якія набліжаны да баявой сякіры (палэкс) [7, o. 138]. III тып складаецца з сякерападобных падвесак унікальных форм [7, o. 139].

**Асноўная частка.** На тэрыторыі Беларусі на сённяшні дзень вядома 16 знаходак сякерападобных падвесак. У 2016 г. В.Г. Беляўцом былі апублікаваныя звесткі толькі аб шасці такіх амулетах, прадстаўлены картаграфічны аналіз, а таксама прапанаваныя некаторыя высновы аб іх культурным кантэксце. Адпаведна, у гэтым артыкуле будуць прадстаўлены звесткі аб 10-ці астатніх падвесках.

Першая з іх (малюнак 1:1; карта 1:6) – гэта сякерападобная падвеска, знойдзеная ў 2018 г. на селішчы Яскавічы-1 у Салігорскім раёне Мінскай вобласці падчас археалагічных даследаванняў. Зроблена са сплаву медзі[3], высокая, з вузкім закругленым лязом. Вушка адламанае. Захаваная вышыня каля 2 см. Паводле класіфікацыі А. Какоўскага адносіцца да тыпу 3 і датуецца ў межах III ст. [1, s. 120]. Рымскі гарызонт селішча Яскавічы-1 датаваны ў межах з канца II па IV ст. і аднесены да кіеўскага культурнага кола, а згаданая падвеска разглядаецца тут як адзін з імпартаў з арэалу цэнтральнапалесскіх помнікаў вельбарскай культуры [9, с. 136].

Яшчэ адна падвеска са сплаву медзі паходзіць з Воранаўскага раёну, з наваколляў г/п Радунь (малюнак 1:8; карта 1:9). Знаходзіцца яна ў фондах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея і з'яўляецца выпадковай знаходкай. Абламанае вушка, паверхня пацёртая [10, с. 4]. Корпус з абодвух бакоў па перыметры ўпрыгожаны гравіраванай трэмалай. Захаваная вышыня 2,7 см, шырыня 2,6 см. Падвеска адносіцца да тыпу К.4, які датуецца пераважна фазай $C_3$ (каля 300 – 375 гг.) [1, s. 102].

Наступныя 6 бронзавых сякерападобных падвесак былі знойдзеныя на могільніку вельбарскай культуры, які знаходзіцца на ворным полі каля в. Малыя Радванічы Брэсцкай вобласці (карта 1:3). Гэта выпадковыя знаходкі, якія былі перададзены ў зборы Вучэбнай лабараторыі музейнай справы Гістарычнага факультэта БДУ ў 2020 г.[4] Усе падвескі выкананыя са сплаваў медзі, нясуць сляды абпалу, часткова дэфармаваныя, пашкоджаныя і пацінаваныя. Верагодна, яны паходзяць з аднаго альбо некалькіх пахаванняў па абраду крэмацыі. Першая падвеска (малюнак 1:2) падобная на падвескі тыпу 3 па А. Какоўскаму. Захавалася частка скручанага колца. Частка ляза падвескі была страчана. Захаваная вышыня 2,4 см, шырыня 1,9 см. Аплаўленая, хутчэй за ўсё, падчас крэмацыі, дэфармаваная. Другая падвеска (малюнак 1:3) абпаленая, вушка і частка ляза страчаны, пакрытая цёмна-зялёнай пацінай. Адносіцца да тыпу К.5. Захаваная вышыня 1,8 см, шырыня 1,1 см. Трэцяя (малюнак 1:4) – адносіцца да тыпу К.4, зроблена з бронзы. Пакрыта цёмна-зялёнай пацінай. Мае сляды абпалу. Страчана частка ляза. Захаваная вышыня 2,1 см, шырыня 1,4 см. Чацвёртая падвеска (малюнак 1: 5) адносіцца да варыянту К.3. Страчана частка ляза. Захаваная вышыня 2,8, шырыня 1,6 см. Таксама была абпалена, хутчэй за ўсё, падчас крэмацыі. Пятая (малюнак 1: 6) мае характэрныя рысы тыпу К.4. Страчана частка ляза. Вышыня знаходкі 2,4 см, шырыня 1,6 см. Апошняя сякерападобная падвеска пакрытая цёмна-зялёнай пацінай. Абпаленая і дэфармаваная. блізкая да тыпу К.3. Захаваная вышыня 1,7 см, шырыня 1,4 см. Усе падвескі з Малых Радваніч датуюцца фазай $C_2$ (каля 260 – 300 гг.) [1, s. 102].

Сякерападобная падвеска, выпадкова знойдзеная каля в. Загор'е Пружанскага раёну (малюнак 1:7; карта 1:2), паступіла ў Нацыянальны гістарычны музей у 2019 г.[5]. Захаваная вышыня 2,5 см, шырыня 3 см, моцна пацінаваная і зацёртая, вушка адламанае. Верагодней за ўсё, як і падвеска з-пад Радуні (малюнак 1: 8), павінна быць аднесеная да тыпу К.4 [1, s. 102].

---

[2] Даследчыца дадзеную групу так і называе – "сякерападобныя".

[3] Усталяванне матэрыялу вырабу падвесак у гэтым і наступных выпадках зроблена на падставе знешніх марфалагічных прыкмет.

[4] № 15–19, 36.

[5] Без інвентарнага нумару.




**Малюнак 1. – Сякерападобныя падвескі з Яскавіч (*1*), М. Радваніч (*2 – 6*), Загор’е (*7*), Радунь (*8*), Мерчыцы (*9*). Малюнкі В.Г. Беляўца і аўтара**

Апошняй з’яўляецца падвеска, якая была знойдзена каля в. Мерчыцы Пінскага раёну (малюнак 1: 9; карта 1:10). Яна паступіла ў Вучэбную лабараторыю гістарычнага факультэта БДУ ў 2017 г.[6] Захаваная вышыня 2,4 см, шырыня 2,5 см, пацінаваная і зацёртая. Яе таксама магчыма аднесці да тыпу К.4 [1, s. 102]. Датаваць знаходку мы можам фазай $C_3$. Каля вёскі знаходзіцца шматслойнае селішча Мерчыцы-2, разведачныя працы В.Г. Беляўца на якім дазволілі вызначыць, што помнік актыўна выкарыстоўваўся, пачынаючы з ранняга жалезнага веку і заканчваючы эпохай Вялікага перасялення народаў [11, с. 253]. Пры гэтым дадзеную знаходку мы павінні звязваць з гарызонтам вельбарскай культуры.

Як пісалася раней, В.Г. Беляўцом былі зроблены высновы наконт картаграфіі сякерападобных падвесак на тэрыторыі Беларусі, а менавіта падвескі дадзенай формы канцэнтруюцца на паўднёвым захадзе краіны ў Беларускім Пабужжы і Прыпяцкім Палессі; адзіныя знаходкі паходзяць з тэрыторыі Паўночнага Перадпалесся і Панямоння. Новыя знаходкі сякерападобных падвесак у цэлым адпавядаюць гэтым высновам, дапаўняючы іх (гл. карту 1). Яны падкрэсліваюць праблематычнасць інтэрпрэтацыі культурнага кантэксту часткі з гэтых упрыгожанняў. Культурная прыналежнасць 11-ці сякерападобных падвесак, якія паходзяць з помнікаў вельбарскай культуры, не выклікае пытанняў – гэта экзэмпляры з Бухліцкага Хутара, Плошчава ды Ступічава [2, с. 64–66], да якіх дадаюцца падвескі з Малых Радванічаў. Магчыма, наяўнасць помніка альбо актыўнасць насельніцтва вельбарскай культуры маркіруе таксама падвеска з Загор’я.

Астатнія падвескі выходзяць па-за межы арэала гэтай культуры – гэта знаходкі з помнікаў Івань, Больцішкі, Яскавічы, Радунь, Мерчыц. Па-за арэалам вельбарскай культуры на тэрыторыі Беларусі сякерападобныя падвескі выступаюць у двух рэгіёнах: на паўночных ускрайках Цэнтральнага Палесся і на поўначы Беларускага Панямоння. Пры гэтым на сённяшні дзень цяжка казаць пра культурны кантэкст знаходак з Івані, Радуні, Бальцішкаў: падаецца верагодным, што гэтыя знаходкі сякерападобных падвесак адлюстроўваюць сувязі мясцовага насельніцтва кола культур усходнееўрапейскай лясной зоны з носьбітамі вельбарскай культуры.

[6] А1-13-17.




**1 – Ступічыва; 2 – Загор’е; 3 – Малыя Радванічы; 4 – Плошчава; 5 – Бухліцкі хутар; 6 – Яскавічы; 7 – Івань; 8 – Больцішкі; 9 – Радунь; 10 – Мерчыцы**

**Карта 1. – Картаграфія знаходак сякерападобных падвесак на тэрыторыі Беларусі**

Верагодней за ўсё, падвескі з Івані і Яскавіч паступалі ад “гоцкага” насельніцтва з Цэнтральнага Палесся. Бліжэйшы вельбарскі помнік тут зафіксаваны каля Мікашэвіч [12, с. 128] – прыкладна 40 км ад Яскавічы і 80 км да Івані. Сыходзячы з апошніх звестак аб помніках гэтай культуры ў Палессі – у месцах упадзення ў Прыпяць яе буйных прытокаў, рэк Ясельды і Гарынь, – прысутнасць гоцкага насельніцтва тут магла захоўвацца да фазы $D_2$ уключна. Пры гэтым насельніцтва магло быць уцягнута ў сувязі ўнутры знікаючай ужо “гоцкай айкумены” паміж Падунаў’ем, Паўночным Прычарнамор’ем і Польскім Памор’ем. Доказам гэтага могуць служыць такія знаходкі, як шчыток ад спражкі тыпу Стшэганіцэ-Цішаладаны-Керч (Strzegocice-Tiszaládány-Kerč) і фібула-цыкада серыі Керч з селішча Мерчіцы [11, с. 252]. У беларускім Цэнтральным Палессі датыроўкі позніх матэрыялаў вельбарскай культуры і ранніх пражскіх перакрываюцца на працягу большага, чым меркавалася, адрэзка – з другой паловы IV па першыя дзесяцігоддзі V ст. [13, с. 124]. Хутчэй за ўсё, насельніцтва двух культурных колаў суіснавала ў розных частках Прыпяцкага Палесся на працягу большай часткі гунскага перыяду, пры гэтым праходзіла паступовае паслабленне пазіцый готаў і ўсё больш шырокага рассялення раннегістарычных славян [13, с. 125].

Сякерападобныя падвескі з тэрыторыі Панямоння, хутчэй за ўсе, з’яўляюцца сведчаннем кантактаў мясцовых жыхароў з вельбарскім насельніцтвам з тэрыторыі Беласточчыны: бліжэйшым вельбарскім помнікам з’яўляецца Чупрынава, які знаходзіцца на р. Ласосна – левым прытоку Нёмана [14, s. 37]. Пры гэтым блізкае размяшчэнне помнікаў (вёскі Бальцішкі і Радунь знаходзяцца на адлегласці 15–16 км адна ад адной) можа казаць аб тым, што падвескі, верагодна, дасягнулі гэтага рэгіёну агульным шляхам. Трэба адзначыць, што ў гэтым рэгіёне апошнім часам усё больш адзначаюць месцазнаходжанняў з рэчамі, якія магчыма аднесці да вельбарскага насельніцтва. Уплыў “готаў” у гэтым рэгіёне пачынаецца на рубяжы II/III ст. На гэта ўказвае фібула тыпу А.41, варыянту Z паводле Я. Шустара, з-пад в. Стараельня Дзятлаўскага раёну [10, с. 8]. Інтэнсіўнасць гэтых жа сувязей дасягае піку напрыканцы познерымскага перыяду і ў пачатку Вялікага перасялення народаў. Фінальны ж яго эпізод

характарызуе скарб з Алекшыц Бераставіцкага раёну, які магчыма датаваць не раней за рубеж IV–V стст. – першую трэць – сярэдзіну V ст. [10, с. 9].

Прысутнасць знаходак у Панямонні, якія могуць датычыцца насельніцтва культур гоцкага кола (скарбы з срэбнымі рымскімі манетамі, некаторыя тыпы фібул) можа з'яўляцца паказчыкам паступовага перамяшчэння часткі вельбарскага насельніцтва ў бок земляў сучаснай Літвы. Аднак, на сённяшні дзень такая інтэрпрэтацыя знаходак, якія з'яўляюцца выпадковымі і паходзяць ад "аматараў археалогіі", пакуль можа насіць толькі гіпатэтычны характар.

**Заключэнне.** Такім чынам, на сённяшні дзень на тэрыторыі Беларусі знойдзена 16 сякерападобных падвесак, большасць з якіх паходзіць з арэала вельбарскай культуры. Што тычыцца знаходак па-за межамі арэала, то падвескі з тэрыторыі Прыпяцкага Палесся з'яўляюцца сведчаннем суіснавання гоцкага насельніцтва і насельніцтва ўсходнееўрапейскай лясной зоны на працягу большай часткі гунскага часу, а "сякеркі" з тэрыторыі Панямоння – аб паступовым перамяшчэнні часткі гоцкага насельніцтва ў бок сучаснай Літвы.

ЛІТАРАТУРА

1. Kokowski A. Metalowe węsiorki w krztałcie topora na terenie Barbaricum na północ i północny–wschód od limesu rzymskiego, w okresie rzymskim i we wcesnym okresie wędrówek ludów // 20 lat arheologii w Masłomęczu: 2 t. / pod red. J. Ilkjæra, A. Kokowskiego. – Lublin, 1998 – S. 99–116.
2. Белевец В.Г. О находках топоровидных подвесок позднеримского времени на территории Беларуси // OIUM, Вип. 5: Черняхівська культура. До 85-річчя від для народження І.С. Винокура. – Киів, 2016. – С. 59–67.
3. Бондаренко Г., Охріменко Г., Локайчук С., Скляренко Н., Ільчук С. Старожитності готів на Волині. – Луцьк: Вежа-Друк, 2021.– 236 с.
4. Imiołczyk E. Miniaturyzacja różnych form kulturowych w kulturze kręgu gocko-gepidzkiego w okresie rzymskim i wędrówek ludów. – Poznan, 2009. – 252 s.
5. Tempelmann-Mączyńska M. Srtoj kobiecy ludności kultury wielbarskiej i jego powizania z sasiednimi obszarami // Kultura wielbarska w młodszym okresie rzymskim: (materiały z konf.) / pod red. J. Gurby, A. Kokowskiego. – Lublin, 1989. – T. 2. – S. 205–218.
6. Стоянова А.А. Металеві підвіски у формі сокирок із Криму // Археологія. – Кіеў, 2005. – № 2 – С. 47–54.
7. Gulyás Gy. A balta alakú csüngők a szarmata leletanyagban (Axe-shaped pendants among Sarmatian finds). In: Hadak útján. A népvándorláskor fiatal kutatóinak XXIV. Conference of young scholars ont he Migration Period, Esztergom, November 4–6. 2014. Studia ad Archaeologiam Pazmaniensia. Archaeological Studies of PPCU Department of Archaeology – A PPKE BTK Régészeti Tanszékének kiadványai 3.1. – Magyar Tudományos Akadémia Bölcsészettudományi Kutatóközpont Magyar Őstörténeti Témacsoport Kiadványok 3.1. Főszerk.: Türk A., szerk.: Balogh Cs. – Major B. Esztergom 2015, – O. 129–163.
8. Кухаренко Ю.В. Могильник Брест-Тришин / Акад. наук СССР, Ин-т археологии. – М: Наука, 1980. – С. 50.
9. Белявец В.Г. Даследаванні на селішчы Яскавічы-1 у 2018 г.: да вывучэння помнікаў "перадпражскага" гарызонту на Беларускім Палессі // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. – 2019. – № 3 – С. 110–145.
10. Белявец В. Рэчы вельбарскага паходжання ў зборах Гродзенскага Дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея // Labor omnia vincit. Праца заўсёды перамагае: матэрыяльная культура ў гістарычным кантэксце. Праблемы вывучэння і захавання: матэрыялы навуковай канферэнцыі (г. Гродна, 6-7 мая 2021 г.) / УК "Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі"; рэдкал.: А.У. Ціхаміраў (гал. рэд.), А.Д. Гаршкоў. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2022 – С. 3–14
11. Белевец В.Г. Результаты разведочных работ на поселении Мерчицы-2 и перспективы изучения памятников римского времени и эпохи Великого переселения народов в белорусском Полесье // Европа от Латена до Средневековья: варварский мир и рождение славянских культур: К 60-летию А.М. Обломского. – 2017. – № 19. – С. 249–261.
12. Белявец В.Г. Помнікі вельбарскай культуры ў Турава-Пінскім Палессі: праблемы вывучэння // Гіст.-археал. зб. / Нац. акад. навук Беларусі. – 2008. – № 22. – С. 124–143.
13. Белевец В.Г. Бутероль из Яскович: к изучению эпохи Великого переселения народов в Припятском Полесье // Stratum plus. – 2020 – № 4 – С. 115–130.
14. Andrzejowski J. Ciekawe materyały z okresu rzymskiego znalezione w Czuprynowie w woj. Białostockim // Nunc de suebis disendum est: studia dedukowane profesorowi Jeżemu Kolendo w 60-lecie urodzin i 40-lecie pracy naukowej / Inst. Archeologii Uniw. Warszawskiego; [red.: A. Bursche, M. Mielczarek, W. Nowakowski]. –Warszawa, 1995. – S. 35–46.

*Пастуніў 12.04.2023*

## О НОВЫХ НАХОДКАХ ТОПОРОВИДНЫХ ПОДВЕСОК НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

***В.А. ЛУЧШЕВА***
***(Институт истории НАН Беларуси, Минск)***

*Статья посвящена топоровидным подвескам с территории Беларуси, которые были найдены за последние годы. Рассмотрены вопросы интерпретации данных украшений, их датировка и картография. Подвески с территории Припятского Полесья являются свидетельством сосуществования готского населения и населения восточноевропейской лесной зоны на протяжении большей части гуннского времени, а "топорики" с территории Понемонья – о постепенном перемещением части готского населения в сторону современной*

*Литвы. Данные выводы могут быть использованы для дальнейшего изучения контактов населения восточноевропейской лесной зоны и готского населения в этот период.*

***Ключевые слова:*** *археология Беларуси, железный век, позднеримское время, вельбарская культура, готы, шейные украшения, топоровидные подвески, картография, типология.*

## NEW FINDS OF AXE-SHAPED PENDANTS ON THE TERRITORY OF BELARUS

***U. LUCHSHEVA***
***(Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*The article is devoted to axe-shaped pendants from the territory of Belarus, which have been found in recent years. The issues of interpretation of these ornaments, their dating and cartography are considered. The pendants from the territory of the Pripyat Polesie are evidence of the coexistence of the Gothic population and the population of the Eastern European forest zone for most of the Hunnic time, and the "hatchet" from the territory of the Ponmont region indicates the gradual movement of part of the Gothic population towards modern Lithuania. These findings can be used to further study the problems of contacts between the Eastern European forest zone and the Gothic population during this period.*

***Keywords:*** *archaeology of Belarus, Iron Age, Late Roman times, velbar culture, Goths, necklace, axe-shaped pendants, cartography, typology.*